ПРЫВІТАННЕ, МІНСК!

Фота В. Жука.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (856) ● ПЯТНІЦА, 1 верасня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

СА СВЯТАМ ВЕДАЎ, СЯБРЫ!

У ПАЧАТКУ ДАРОГІ

Сёння дзверы нашага універсітэта гасцінна расчыніліся перад першакурснікамі. Іх у гэтым годзе каля дзвюх тысяч чалавек. Многія імкнуліся стаць студэнтамі адной з вядучых ВНУ краіны. Але толькі самым падрыхтаваным пашчаслівілася атрымаць студэнцкі білет з паметкай БДУ.

321 чалавек здаваў экзамены на біялагічны факультэт. З іх 35 медалістаў і закончыўшых сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на выдатна. 106 чалавек мелі граматы па біялогіі, хіміі, фізіцы. Большасць абітурыентаў паказала глыбокія веды па ўсіх раздзелах праграмы. Многія ў сваіх адказах не абмяжоўваліся матэрыялам школьнага падручніка, а паказалі веданне навейшых фактаў развіцця сучаснай біялогіі. Іх адказы вызначаліся высокай культурай мовы, свабодным валоданнем біялагічнай тэрміналогіяй. Медалісты Н. Іваненка, якая закончыла СШ № 2 г. Быхава, І. Перлава (СШ № 6 г. Мінска), Г. Палюховіч (СШ № 35 г. Мінска), Н. Саковіч (СШ № 2 г. Клімавічы) і В. Лучко (Крупаўская СШ Лідскага раёна) і іншыя здалі біялогію на выдатна.

Экзамены паказалі, што на факультэт прыйшло добрае папаўненне.

Многія юнакі і дзяўчаты з паступіўшых на факультэт журналістыкі маюць граматы па рускай або беларускай мове і літаратуры. Гэта людзі, улюбёныя ў мастацкае слова. Сярод іх Аляксандр Хілімон, які закончыў у 1969 годзе Карэліцкую СШ, служыў у арміі, друкаваўся ў армейскай газеце і адначасова займаўся ў школе юнкораў пры газеце «Знамя юности». Наташа Новікава — актыўны карэспандэнт сваёй раённай газеты і рэспубліканскага маладзёжнага друку. Аляксандр Шэўка ў гэтым годзе закончыў Ельскую сярэднюю школу Гомельскай вобласці. Шмат друкаваўся ў раённай газеце «Ленінская праўда». Святлана Шыдлоўская, выпускніца СШ № 36 г. Мінска — лаўрэат абласнога конкурсу-віктарыны «Мая Беларусь». Таня Скібіцкая закончыла школу № 4 г. Ваўкавыска. Друкавалася ў «Настаўніцкай газеце», «Знамени юности». У мінулым годзе Таня была ўдзельніцай рэспубліканскага злёту маладых рабкораў. Пасля злёту яна сказала: «У рабочых і сельскіх карэспандэнтаў 20-х гадоў, стойкіх, бясстрашных, сумленных, якія знаходзіліся ў гушчыні народнага жыцця, адданых справе партыі, народа, павінны вучыцца мы, рабкоры 70-х гадоў». За актыўнае супрацоўніцтва ў раённых газетах узнагароджаны граматамі Л. Нікуліна і А. Бондар.

Многа выдатнікаў вучобы, медалістаў паступіла і на іншыя факультэты нашага універсітэта ў гэтым годзе. Усе яны поўныя энергіі і жадання авалодаць выбранай спецыяльнасцю. Поспехаў вам, сябры!

Л. ПЕРАСЫПКІНА.

НЯМА ДРУГАРАДНАЙ РАБОТЫ

Мы ўступаем у новы навучальны год, год 50-годдзя ўтварэння СССР. Усе дарогі нашых студэнтаў вядуць зараз ва універсітэт. Хто хадзіў казахстанскім стэпам або працаваў у Томскай тайзе, выязджаў за межы нашай краіны — сабраліся ў адных сценах. Нельга пераказаць пачуцці, думкі і хваляванні. Колькі людзей, столькі і ўражанняў. Але ці можна, напрыклад, не адчуць радасці першакурснікаў, якія таропка снуюць у гэтыя дні па калідорах і аўдыторыях універсітэта! Яны вытрымалі першы сур'ёзны экзамен — прыадчынілі дзверы ў свет навукі, свет яшчэ не пазнанага жыцця.

Але прыўзняты настрой не перашкаджае камітэтам камсамола факультэтаў сканцэнтраваха працаваць, каб накіраваць летнюю энергію студэнтаў у вучэбнае рэчышча, адразу ўключыць іх у размераны рытм універсітэцкага жыцця. Асаблівая ўвага першакурснікам і клопат аб тым, каб яны не пабаяліся цяжкасцей, а смела і ўпэўнена займалі сваё месца, па праву імі заваяванае. Думаецца, што камітэты камсамола, як і ў мінулым годзе, зробяць усё, каб ініцыятыва першакурсніка атрымала найбольшае развіццё, а яго памылкі не сталі глыбокімі траўмамі.

Такі толькі пералік напрамкаў работы камсамольскай арганізацыі. А можна было б лічыць далей: шэфства, праца ў інтэрнаце, мастацкая самадзейнасць, ваенна-патрыятычнае выхаванне, спорт, інтэрработа. Ды ўсё не пералічыць. Важна, каб камітэты камсамола ўзялі арыенцір на тое, што няма работы другарадней, кожная — напружанне духоўных і фізічных сіл, каштоўная для грамадства.

Вялікую дапамогу камітэтам могуць аказаць партыйныя бюро факультэтаў. Мудрае слова, паўсядзённы клопат старэйшых таварышаў падбадзёрвае, аказвае маральную дапамогу, падказвае камсамольскім работнікам усіх рангаў правільны кірунак на бліжэйшы час. Такое становішча склалася на філалагічным, фізічным, біялагічным, факультэце журналістыкі, дзе ўвайшла ў паўсядзённасць добразычлівая дапамога партыйных арганізацый камсамолу, дзе існуе адзіны фронт барацьбы за веды, за выхаванне высокаінтэлектуальнай асобы.

Ёсць яшчэ адзін важны ўчастак дзейнасці камітэтаў камсамола. Партыя і ўрад праяўляюць пастаянны клопат аб паляпшэнні бытавых і матэрыяльных умоў студэнцтва. Гэта патрабуе канкрэтызацыі працы ў інтэрнатах, прынцыповых адносін у справе назначэння стыпендый, больш клопатаў аб этычным і эстэтычным выхаванні студэнтаў, строгага ўліку і размеркавання грамадскай працы на ўсіх членаў нашага шматтысячнага калектыву.

Камітэт камсамола віншуе ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў з пачаткам навучальнага года. Жадаем плённых поспехаў у рабоце!

А. СЛУКА,
сакратар камітэта камсамола БДУ.

ПАПАЎНЯЕЦЦА СТУДЭНЦКАЯ СЯМ'Я

Адзвінела студэнцкімі галасамі гарачае лета. Вярнуліся з новабудоўляў мужныя і загарэлыя байцы будаўнічых атрадаў. Каля дошак аб'яў тоўпяцца першакурснікі. Яны ўсё да драбніц стараюцца запісаць, нічога не прапусціць.

На розных мовах словы «вучоба», «студэнт», «семестр» гучаць вараз і на падрыхтоўчым факультэце для замежных студэнтаў. Пакуль што прыехалі першыя прадстаўнікі з рэспублікі Бангладэш, Сенегала, Танзаніі. Чакаецца прыезд студэнтаў з ДРВ і Паўднёвага В'етнама, краін Лацінскай Амерыкі і Афрыканскага кантынента.

В. КАЛАДЗІНСКІ.

На здымку: студэнты І курса ФПМ знаёмяцца са студэнтамі з Бангладэш, якія прыехалі вучыцца ў БДУ.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ПАВЕДАМЛЯЕ:

Студэнцкі будаўнічы атрад імя Ліліі Карастаянавай, які працаваў у Балгарыі, заняў II месца сярод інтэрнацыянальных атрадаў. Ён прызнан ударным. Байцы гэтага атрада ўзнагароджаны значком «Ударнік».

***

Не адсталі ад сваіх сяброў і байцы атрада «Беларусь-72», што працаваў у ГДР. За добрую працу яны атрымалі «Ганаровую медаль».

***

29 жніўня ў Мінск прыбылі цалінныя будаўнічыя атрады. Універсітэт горача вітаў юнакоў і дзяўчат, якія ўзводзілі ў казахстанскіх стэпах жылыя дамы, дзіцячыя сады і яслі, школы і гаспадарчыя пабудовы. Камандаваў зводным цалінным атрадам сакратар камітэта камсамола фізфака Г. Стакроцкі.

***

Нядаўна наш універсітэт наведала дэлегацыя французскай моладзі. Аб БДУ, яго гісторыі і сённяшнім дні расказаў гасцям прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С. А. Умрэйка. Потым госці агледзелі універсітэт.

АДКАЗНЫ ГРАМАДСКІ ДОЎГ

Сёлетні навучальны год—год 50-годдзя ўтварэння СССР — адзначаецца шырокім размахам творчай актыўнасці савецкіх людзей. Многа слаўных пачынанняў нарадзілася на фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах. Многа цудоўных спраў і пачынанняў належыць навуковым і вузаўскім калектывам. Прафесарска - выкладчыцкі састаў Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава і Маскоўскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту звярнуліся да ўсіх навуковых работнікаў Масквы з заклікам шырока разгарнуць лекцыйна - прапагандысцкую работу па падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР.

Члены таварыства «Веды» нашага універсітэта, адобрыўшы каштоўную ініцыятыву вучоных маскоўскіх вну, усямерна падтрымалі гэты пачын і звярнуліся да вучоных, навуковых работнікаў і выкладчыкаў вну нашай рэспублікі з заклікам дастойна сустрэць 50-годдзе ўтварэння СССР.

Абапіраючыся на накоплены вопыт, замацоўваючы яго, мы павінны далей удасканальваць дзейнасць усіх нашых звенняў. Не толькі знаёміць працоўных з дасягненнямі сучаснай навукі, але і павысіць мэтанакіраванасць, наступальнасць лекцыйнай прапаганды, больш аргументавана ацэньваць падзеі і з'явы, узмацніць ідэйна-выхаваўчае ўздзеянне нашых лекцыйных выступленняў.

Члены таварыства «Веды» БДУ ў сваім звароце, адобраным прэзідыумамі рэспубліканскага і гарадскога праўленняў таварыства «Веды», узялі на сябе рад абавязацельстваў: правесці на некаторых прамысловых прадпрыемствах Мінска і ў падшэфных раёнах цыклы лекцый «Па краіне Вялікага Кастрычніка», «Ад штурму Зімняга да штурму космасу» і г. д. Універсітэцкія лектары арганізуюць 25 калектыўных выездаў у калгасы і саўгасы Мінскай і іншых абласцей рэспублікі. На прамысловых прадпрыемствах Мінска адбудуцца дні лектара, будуць выкарыстаны такія формы прапагандысцкай работы, як «Трыбуна вучонага», сустрэчы нашых лектараў з рабочымі фабрык і заводаў, з працаўнікамі сёл.

Для лектара кожнае выступленне — гэта сустрэча з новай аўдыторыяй, з новымі групамі працоўных. Шырыня кантактаў, назіранняў, улік прафесіянальных, псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцей слухачоў ўзбагачае і лектара.

Асаблівую ўвагу нам трэба ўдзяліць прыцягненню маладых лектараў з ліку выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў і здзейсніць сістэму фарміравання і выхавання лектарскіх кадраў, павышэння іх кваліфікацыі і майстэрства. У гэтых адносінах адказнай з'яўляецца роля школы маладога лектара.

Наша задача — поўнасцю выкарыстаць магчымасці, якія ёсць у арганізацыі таварыства «Веды» БДУ, для распаўсюджання патрыятычнага пачыну калектываў вядучых вну краіны.

М. РЭЗНІКАЎ,
старшыня раённага аддзялення таварыства «Веды» БДУ, дацэнт.

СЯБРОЎСКІЯ СУВЯЗІ

Даўняя дружба існуе паміж нашым універсітэтам і універсітэтамі Польшчы, Балгарыі і ГДР. Штогодні абмен дэлегацыямі, сяброўскія сустрэчы яшчэ больш узмацняюць яе. Толькі гэтым летам у Варшаўскім і Кракаўскім універсітэтах праходзілі практыку 30 студэнтаў-філолагаў. Вярнулася група геаграфаў з Балгарыі. На верасень таксама намячаецца шырокая праграма абмену студэнтамі-практыкантамі. У Балгарыю паедуць фізікі, у ГДР — тры групы біёлагаў. У сваю чаргу папоўняць у нас свае веды па рускай мове філолагі з Кракава, па хіміі — студэнты з ГДР.

В. ЛІДЗІНА.



На здымку: даследаванні вядзе ст. навуковы супрацоўнік кафедры фізічнай хіміі **Я. Г. Гусеў.**



Мантаж стэнда для выпрабавання вырабаў металакерамічнымі награвальнікамі вядуць супрацоўнікі кафедры фізікі цвёрдага цела **М. К. Федасеенка** і **У. І. Мілько.**
Фота **Д. Чаховіча.**

ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ НА БАРЫСАЎШЧЫНЕ

Закончыўся студэнцкі працоўны семестр 1972 года, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Аб гэтым сведчаць і ажыўленыя групы рабят у формах зеляновага колеру з эмблемамі СБА, якіх мы сустракаем у горадзе. І цяпер, калі загарэлыя, узмужнелыя і ўзбагачаныя духоўна байцы вяртаюцца дадому, у родную вну, можна падвесці некаторыя вынікі іх работы.

Мне хочацца расказаць аб рабоце СБА БДУ ў Барысаўскай зоне. Іх было 19 у Барысаўскім міжраённым студэнцкім будаўнічым атрадзе, роўна палова ўсіх, што дыслакаваліся тут.

Кіламетры меліярацыйных каналаў, сцены кармацэхаў і птушніка, 2 мільёны штук зробленай цэглы, сотні тон укладзенага бетону і асваенне паўмільёна капіталаўкладанняў—такі падарунак юбілею. Зладжана і па-ўдарнаму працавалі атрады хімічнага факультэта «Нептуній» (камандзір Г. Галалоб, камісар В. Грыгарэнка), фізічнага факультэта «Імпульс» (камандзір Л. Семяненка, камісар Р. Саевіч), матэматычнага факультэта «Брыганціна» (камандзір С. Значонак, камісар Т. Смятаннікава).

Аднак не ва ўсіх атрадах справы ішлі добра. Зрывы ў рабоце былі ў атрадах «Альтаір» (фізфак), «Імпульс». Іх дрэнна забяспечвалі будаўнічымі матэрыяламі. Было над чым задумацца камандзірам СБА «Рытм» (ФПМ) і «Байкал» (фізфак): не ўсё ладзілася з выкананнем плана. А два атрады — «Журавінку» і «Белую Русь»—з-за адсутнасці неабходнага фронту работ тэрмінова давялося перадыслакаваць у Віцебскую вобласць. Але на тое яна і студэнцкая будоўля. Тут, як ні ў якім месцы, падвяргаюцца выпрабаванню воля, упартасць, сіла характару камандзіра, яго ўменне працаваць з людзьмі.

Цікава наладзіць вольны час байцоў—таксама нялёгкая справа. Добра справіліся з гэтым ў СБА «Імпульс», «Нептуній», «Брыганціна», «Альтаір» (камандзір С. Семянцоў, камісар А. Мазурэнка), «Дружба» (камандзір М. Нікішын, камісар М. Свораб) і іншыя. Тут праводзіліся дні пасвячэння ў будаўнікі, спартыўныя спаборніцтвы. А футбольная каманда «Альтаіра» выйграла кубак Лошніцкага сельсавета. Паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, сустрэчы з ветэранамі вайны, лекцыі і канцэрты мастацкай самадзейнасці, дыспуты і вечары адпачынку з мясцовай моладдзю—вось далёка не поўны пералік студэнцкіх спраў.

Надоўга запомняцца піянерам пасёлка Цэнтральны Смалявіцкага раёна, вёсак Худоўцы і Ваўкавыск Крупскага раёна тыя дні, якія яны правялі ў студэнцкіх лагерах «Спадарожнік». Студэнты Дзядовіч, Карпіцкая, Чупрынская, Шыла, Блашкевіч, Баравік і іншыя развучвалі з піянерамі песні, вершы, арганізоўвалі канцэрты для бацькоў, праводзілі ваенна-спартыўную гульню «Зарніца».

Дзесяткі лекцый, прачытаных студэнтамі на заводах і палявых станах, канцэрты мастацкай самадзейнасці, шэфства над помнікамі воінам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, дапамога сем'ям загінуўшых воінаў і пенсіянерам, пабудаваныя спортпляцоўкі і перададзеныя школам наглядныя дапаможнікі, стэнды, кнігі — усё гэта падарунак студэнтаў БДУ слаўнаму юбілею.

Т. АДУЛА,
камісар Барысаўскага міжраённага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

ВАМ, ПЕРШАКУРСНІКІ!

ПЕРШАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ УНІВЕРСІТЭТА

Нашу краіну называюць вялікай кніжнай дзяржавай, а савецкі народ — самым чытаючым.

Для савецкага чалавека кніга стала важнай крыніцай фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду, атрымання рознабаковых ведаў, надзейным памочнікам у працы. Кніга — прадукт працы вучонага, яна ж—інструмент яго працы, не менш важны, чым тэлескоп для астранома або мікраскоп для біёлага. Яна застаецца галоўнай крыніцай інфармацыі, неад'емнай прыналежнасцю вучэбнага і навуковага працэсу. Вось чаму штодзённа ў бібліятэку універсітэта звяртаюцца сотні чытачоў з самымі разнастайнымі пытаннямі.

Нельга падрыхтавацца да семінара, зрабіць даклад, паведамленне ў навуковым студэнцкім таварыстве, напісаць курсавую, падрыхтавацца да экзаменаў і заліка ў без літаратуры. Ці не таму рэктар Маскоўскага універсітэта прафесар Пятроўскі назваў бібліятэку першай лабараторыяй вну.

А каб быць чытачом бібліятэкі, неабходна на першых парах хоць мець дакладнае ўяўленне аб яе структуры (асноўных аддзелах бібліятэкі і іх функцыях), аб саставе фонду, аб правілах карыстання. Гэтыя веды дапамогуць вам з найбольшай паўнатой выкарыстаць усе магчымасці бібліятэкі. А яны ў яе вельмі вялікія.

Фонд нашай універсітэцкай бібліятэкі складае 1.090.369 кніг. Па свайму саставу ён універсальны, г. зн. падабраны ў адпаведнасці з профілем 13 факультэтаў і 89 кафедр, праблемных лабараторый. Значную частку фонду складаюць падручнікі, але, акрамя іх, ёсць манаграфіі, даведніцкая, папулярная, мастацкая літаратура, перыядычныя выданні (часопісы і газеты) за многія дзесяткі год. Састаўной часткай нашых кніжных багацяў з'яўляюцца творы класікаў марксізму-ленінізму і кнігі па важнейшых праблемах тэорыі марксізму-ленінізму. Бібліятэка абменьваецца выданнямі універсітэта з усімі буйнейшымі навуковымі бібліятэкамі Саюза і сацыялістычных краін. Кожны год на паліцы становяцца да 60 тысяч экземпляраў новых паступленняў. Толькі за адзін год чытачам было выдадзена 1.385.829 экземпляраў кніг, 465 кніг атрымана ў часовае карыстанне з іншых бібліятэк краіны па міжбібліятэчнаму абанементу.

Бібліятэка размяшчаецца на трох паверхах: у цокальным паверсе ў двух'ярусным кнігасховішчы на кніжных паліцах стаіць асноўны фонд бібліятэкі, дысертацыі, аўтарэфераты, дарэвалюцыйныя выданні, амаль уся перыёдыка. Адсюль па ліфту падымаюць кнігі ва ўсе пункты выдачы; на другім паверсе з дапаможнага фонду абанемента кнігі выдаюць на дом; фонд кнігасховішча трэцяга паверха прызначан толькі для работы ў чытальных залах.

Каталогі бібліятэкі дапамогуць вам знайсці патрэбную літаратуру. Па алфавітнаму—вы знойдзеце кнігу, калі ведаеце яе аўтара або назву бязаўтарскай кнігі.

Калі вы хочаце падабраць літаратуру па пэўнай тэме, пытанню, аб пэўнай асобе або падзеі, звярніцеся да сістэматычнага каталогу.

Каб азнаёміцца з навінкамі за тыдзень, наведвайце па аўторках адкрыты прагляд літаратуры. Аб штомесячных новых паступленнях у бібліятэку вас праінфармуе спецыяльны бюлетэнь, які маецца на ўсіх пунктах выдачы.

Не праходзьце міма кніжных выставак. Яны пазнаёмяць вас з літаратурай па самых актуальных пытаннях, асветляць усе знамянальныя падзеі ў жыцці нашай краіны.

Калі вы не валодаеце навыкамі самастойнага падбору літаратуры, звярніцеся ў даведніцка-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі, дзе прадаставяць у ваша распараджэнне каталогі, картатэкі, даведніцкія і бібліяграфічныя выданні, акажуць метадычную дапамогу.

Калі вы жадаеце азнаёміцца з лепшымі выданнямі года, паспрачацца аб прачытаных кнігах, прыміце актыўны ўдзел у нашых літаратурных вечарах і дыспутах.

З першага верасня бібліятэка гасцінна адчыняе дзверы для чытачоў. Сардэчна запрашаем!

З. РАХМАНЧЫК,
загадчык даведніцка-бібліяграфічнага аддзела.

ЗНАЙСЦІ СВАЁ МЕСЦА

Кожны год ва універсітэт прыходзіць новае студэнцкае папаўненне. Ззаду школа, гарачыя дні падрыхтоўкі да паступлення ў вну, хваляванні конкурсных экзаменаў. І вось у руках новенькі студэнцкі білет. Новыя таварышы, новыя, прыемныя словы: лекцыя, кафедра... Здаецца, што ўсё страшнае мінула! А вясной, пасля сесіі, многія, на жаль, вельмі многія з горыччу развітаюцца з універсітэтам. У 1971-72 навучальным годзе з першых курсаў было адлічана 52 студэнты.

Натуральна, узнікае пытанне: чаму юнакі і дзяўчаты, паклаўшыя многа сіл, прайшоўшыя праз высокія патрабаванні ўступных экзаменаў, не маглі прадаўжаць заняткі? Прычын тут многа. Але галоўная з іх — няўменне знайсці сваё месца ў сістэме універсітэцкай адукацыі.

Універсітэт — навучальная ўстанова, дзе падрыхтоўка кадраў вядзецца на аснове спалучэння вучэбнай работы з навуковымі даследаваннямі. Гэты прынцып істотна адрозніваецца ад тых умоў, да якіх на працягу многіх год прывыкае школьнік, і, карыстаючыся тымі ж метадамі ва універсітэце, ён непазбежна церпіць няўдачу.

Паспяховасць пачынаючага студэнта ў значнай меры залежыць ад таго, як хутка зможа ён асвоіцца ў новых абставінах, увайсці ў рытм спецыфічнага рэжыму работы ва універсітэце. Страціў час — страціў веды.

Задача выкладчыкаў — дапамагчы першакурсніку хутчэй «перакавацца» са школьніка ў студэнта і далучыцца да выбранай прафесіі. Падумайце, нашы новыя таварышы, што вы цяпер ведаеце аб сваёй будучай спецыяльнасці? А ўжо хутка вы будзеце абараняць свае першыя навуковыя работы — курсавыя. Гэта не даецца дарма!

Галоўнае, чаму павінен навучыцца студэнт, гэта цаніць свой час. Студэнты старэйшых курсаў добра ведаюць, што вучоба ва універсітэце цяжкая. На выкананне творчасці для кожнай аперацыі ўстаноўлена свая норма — столькі вось дэталей у гадзіну, у дзень, у месяц. Такая норма ва універсітэце вельмі высокая, і гэта трэба ведаць і вучыцца рабіць не толькі добра, але і хутка. Размова аб гэтым вядзецца таму, што студэнты нярэдка ўпадаюць у крайнасці: або стараюцца (з самых лепшых пабуджэнняў) усё рабіць звышстаранна (напрыклад, пераліс-ваюць дома канспект лекцый), або, адчуваючы недахоп часу, пачынаюць у спешцы рабіць сяк-так. Майстэрства вучыцца заключаецца ў тым, каб знайсці залатую сярэдзіну — працаваць хутка і з высокай якасцю. Усё, што можна, рабі адразу, не адкладвай на будучае! Прымусь сябе навучыцца гэтаму — рабіць адразу і добра: добра пісаць канспект лекцыі, добра выконваць лабараторную работу, добра рашаць задачы на практычных занятках, актыўна ўдзельнічаць у семінарскіх занятках, умець правільна канспектаваць першакрыніцы па грамадскіх навуках. Гэта цяжка, вельмі цяжка, але гэтаму трэба вучыцца!

Памылкі, якія часцей за ўсё робіць першакурснік: першая — пасля цяжкага заканчэння школы і паступлення ва універсітэт як не дазволіць сабе месяц-два перадыхнуць! Другая — на занятках ва універсітэце адчуваць сябе гледачом, а не працаўніком, спадзеючыся ўсё, што патрэбна, зрабіць пасля — дома. Вось гэта і азначае ўпусціць час. Большая свабода заняткаў, якую студэнт атрымлівае ва універсітэце, вельмі зманлівая. Увогуле можна адкрыць «таямніцы», якія многае растлумачаць.

Перш чым вы прыйдзеце ў аўдыторыю і сядзеце за парты, выкладчыкі вызначаюць для вас пэўны аб'ём работы, які, нягледзячы на знешні выгляд свабоднага вучэбнага рэжыму, вам усё роўна давядзецца выконваць.

Агульны рэжым студэнцкай працы па ўсіх дысцыплінах устанаўліваецца з тых меркаванняў, што студэнт павінен займацца 9—9,5 гадзіны ў дзень, г. зн. 54—56 гадзін у тыдзень, не лічачы выхаднога дня. Ва універсітэце па званку студэнт займаецца 36 гадзін у тыдзень, і, натуральна, 20—22 гадзіны павінен аддаць самастойнай рабоце. Канешне, гэта сярэднія лічбы, і яны могуць некалькі мяняцца ў той ці іншы бок, але яны характарызуюць умовы, у якіх працуе студэнт: 9 гадзін у дзень!

Калі студэнт нешта недапрацоўвае ва універсітэце («пасля зраблю») і нешта недапрацоўвае пасля («зраблю на наступным тыдні»), то гэта раўназначна таму, што рабочы будзе выконваць палову нормы, спадзеючыся нагнаць у канцы месяца. А норма ж — цяжкая! Толькі на заводзе гэта добра відаць, а ва універсітэце непрыкметна. Так паступова студэнцкая работа «спаўзае» ў канец семестра, а пасля аказваецца, што дзевяці гадзін у дзень мала. І дзесяці, і адзінаццаці мала. І пачынаюцца паніка, бяссонныя ночы і двойкі на экзаменах. Вось і ўся няхітрая гісторыя, якой мы не жадаем першакурснікам.

Вопытныя выкладчыкі даюць вам рэкамендацыі, дапамогуць пазбегнуць памылак і паспяхова перайсці на наступны курс. Але не трэба думаць, што гэтага дастаткова. Галоўнае, вядома, у вас саміх. Таму ні адной рэкамендацыі выкладчыкаў не трэба пакідаць без увагі. З першых крокаў неабходна праяўляць творчы падыход да справы. Бо ў кожнага свае здольнасці, свае схільнасці, свае прывычкі. Усё трэба ўлічваць. Важна і падтрымліваць здаровы рэжым, і знаходзіць такія метады, якія іменна вам дазваляюць працаваць з высокім каэфіцыентам карыснага дзеяння, рацыяналына выкарыстоўваць час. Тады цяжкасцей будзе менш, а поспехаў больш. І ўвогуле, «не багі гаршкі лепяць»! Жадаем усім поспехаў, першакурснікі!

В. ДАЛГАРУКАЎ,
начальнік вучэбнага аддзела.

ВОЛЬНЫ ЧАС—МУЗЫЦЫ, СПЕВАМ, ТАНЦАМ

ВАС ЗАПРАШАЮЦЬ ПРАСЛАЎЛЕНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ БДУ

Новы навучальны год захапіў вас мноствам самых разнастайных, цікавых і неадкладных спраў, але ў віхуры клопатаў знайдзіце час і падумайце, як вы будзеце адпачываць на працягу навучальнага года, дзе прыменіце свае здольнасці і таленты, чым парадуеце сябе і сваіх таварышаў.

Каб дапамагчы вам вырашыць гэтыя пытанні, мы прадастаўляем сёння слова кіраўнікам народных самадзейных калектываў, універсітэта.

М. А. ЛІСІЦЫН, заслужаны работнік культуры БССР, кіраўнік народнага аркестра народных інструментаў:

— Мінулы год быў для нашага калектыву юбілейным. Мы святкавалі сваё 25-годдзе. Гэта дата шырока адзначалася грамадскасцю і патрабавала ад нас вялікай працавітасці. Са справаздачнымі канцэртамі аркестр выязджаў у Маскву, Вільнюс, Ленінград, у гарады і раённыя цэнтры Беларусі. Прыемным быў для нас удзел у абласным конкурсе народных калектываў. Ён завяршыўся заваёвай пераходнага кубка Дзяржаўнага аркестра БССР. У мінулым годзе мы сталі лаўрэатамі Усесаюзнага тэлевізійнага конкурсу народнай творчасці. Канец навучальнага года азнаменаваўся для нас стварэннем фільма-канцэрта, які расказвае аб нашым калектыве.

Пастаянна ў аркестры займаецца 60 чалавек. Гэта фізікі, філолагі, матэматыкі, прадстаўнікі ўсіх курсаў. Шмат сярод іх выдатнікаў. Вопыт паказвае, што сярэдні вучэбны бал удзельнікаў аркестра заўсёды вышэйшы, чым у тых, хто не займаецца ў самадзейных калектывах. Значыць, заняткі ў аркестры вучобе не перашкаджаюць.

Штогод прыблізна пятая частка нашага калектыву абнаўляецца. Пакідаюць аркестр выпускнікі, далучаюцца да заняткаў першакурснікі. Іх вельмі гасцінна сустракаюць старэйшыя таварышы. І не было выпадку, каб, пачаўшы заняткі, навічкі кідалі іх.

Шмат цікавага чакае самадзейных артыстаў у сёлетнім годзе. І перш за ўсё рэспубліканскі і Усесаюзны конкурсы, прысвечаныя 50-годдзю ўтварэння СССР. Прыняць у іх удзел імкнуцца ўсе народныя калектывы БДУ.

У гэтыя дні мы прымаем новае папаўненне і запрашаем у свой калектыў баяністаў, дамрыстаў, цымбалістаў, піяністаў, скрыпачоў і ўсіх жадаючых далучыцца да музыкі. У падрыхтоўчай групе студэнты за год асвойваюць любы народны інструмент і ў наступным годзе пераходзяць у асноўны састаў.

На працягу многіх год з аркестрам выступаюць салісты акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР народная артыстка СССР Т. Ніжнікава, заслужаныя артысты рэспублікі Л. Златава, А. Саўчанка, Ю. Смірноў. Ёсць у нас і салісты-студэнты Я. Сафонаў, лаўрэаты абласнога конкурсу Л. Яроха і Б. Іваноў. Аднак хацелася б, каб сваіх салістаў у нас было больш.

Віншуем вас, сябры, з паступленнем ва універсітэт і запрашаем у наш народны калектыў.

М. В. ЛАПША, кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок»:

— Танцавальны калектыў базіруецца на факультэце грамадскіх прафесій. Яго ўдзельнікі пасля заканчэння універсітэта атрымліваюць дыпломы ФГП на права выкладання харэаграфіі ў калектывах мастацкай самадзейнасці.

За поспехі ў харэаграфічным мастацтве «Крыжачок» у 1969 годзе атрымаў званне народнага. Выступленням нашых танцораў апладзіравалі шматлікія гледачы рэспублікі, Саюза і за мяжой. З вялікім поспехам калектыў выступіў у ГДР і ў Балгарыі, дзе паказаў вялікую канцэртную праграму. Акрамя танцораў, у калектыве ёсць свая аркестровая група і салісты-вакалісты.

Пры ансамблі працуе харэаграфічная студыя — своеасаблівае падрыхтоўчае аддзяленне.

У рэпертуары ансамбля беларускія народныя танцы, танцы народаў СССР і сацыялістычных краін.

У сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя ўтварэння СССР калектыў рыхтуе новую праграму, якая ўключае латышскі танец «Полька старога горада» ў пастаноўцы балетмайстра Рыжскага універсітэта, «Малдаўскую хору», пастаноўку якой зробіць заслужаны артыст Малдаўскай ССР В. Рыжыкаў, новыя беларускія танцы і сярод іх «А ў нас сёння выхадны» і іншыя.

«Крыжачок» у гэтым годзе запрошан для выступленняў з канцэртнай праграмай у Кіеў, Калінінград і іншыя гарады.

Цяпер у калектыве праводзіцца дадатковы набор, і мы запрашаем усіх, хто жадае ўдзельнічаць у ансамблі, займацца ў харэаграфічнай студыі.

Ю. Ф. ШУТОВІЧ, кіраўнік народнай харавой капэлы:

— Сярод самадзейных калектываў БДУ адно з вядучых месц займае народная харавая капэла. Арганізаваны яшчэ ў 1945 годзе, калектыў мае вялікую і цікавую біяграфію. Лаўрэат рэспубліканскіх і абласных конкурсаў, фестываляў, удзельнік міжрэспубліканскіх свят песні і танца (у Тарту, Рызе, Вільнюсе), студэнцкі хор выступае з канцэртамі перад працоўнымі новабудоўляў, прадпрыемстваў, калгасаў рэспублікі.

У мінулым годзе калектыў паспяхова выступіў у абласным конкурсе харавых калектываў, атрымаўшы ганаровую II прэмію.

Але ўсё ж галоўнай задачай нашай цяжкай, клапатлівай працы з'яўляецца выхаванне маладога слухача на лепшых узорах харавой, вакальнай, сімфанічнай музыкі, далучэнне моладзі да выканаўчай дзейнасці.

Кантынгент удзельнікаў капэлы — студэнты малодшых курсаў і выпускнікі, аспіранты і выхаванцы універсітэта, якія ўжо працуюць на вытворчасці. Сярод іх студэнты Г. Засмужац, У. Герасіменка, Н. Дзіашава, В. Дзмітрук, кандыдат хімічных навук Г. П. Шаўчэнка. Не парываюць сувязі з капэлай А. Козіч, О. Прыма, муж і жонка Дарагушы.

Любы студэнт нашай вну, які валодае скромнымі слухавымі і галасавымі данымі, пры акуратных адносінах да заняткаў можа стаць паўнапраўным удзельнікам нашага калектыву.

***

Рэпетыцыі народных калектываў, як правіла, праводзяцца два-тры разы ў тыдзень.

Запісацца ў лік удзельнікаў самадзейных калектываў БДУ можна ў праўленні клуба (галоўны корпус, пакой 205).

Універсітэцкія танцоры і харысты на традыцыйным свяце песні ў Рызе.

Фота *Д. Прэса.*



У ДРУЖБЕ З ГПА

1972 год — год знамянальных падзей у фізкультурным жыцці савецкага народа. Усюды ў краіне праходзяць масавыя спаборніцтвы рабочых і служачых, студэнтаў і супрацоўнікаў вну пад дэвізам «Алімпійскі год — не толькі для алімпійцаў», прысвечаныя 50-годдзю ўтварэння СССР.

Развіццю масавага фізкультурнага руху ў многім садзейнічае новы комплекс ГПА. Ён становіцца верным спадарожнікам розных пакаленняў савецкіх людзей. Сталым дапамагае ўмацаваць здароўе, юным — уступіць у жыццё фізічна моцнымі, загартаванымі. І невыпадкова бюро ЦК ВЛКСМ у сваёй пастанове падкрэслівае: «...лічыць важнейшай задачай кожнай камсамольскай арганізацыі паўсюдзённую арганізатарскую работу па прапагандзе і ўкараненню ў жыццё новага фізкультурнага комплексу «Гатоў да працы і абароны СССР».

Ва універсітэце з моманту апублікавання комплексу разгарнулася работа па яго прапагандзе і ўкараненню. Прайшлі масавыя спаборніцтвы па лыжнаму спорту, лёгкай атлетыцы, плаванню і стральбе. У здачы норм новага комплексу ГПА прынялі ўдзел 16489 чалавек, 8227 здалі кантрольныя нарматывы.

З 1 верасня ў калектыў універсітэта ўвальецца вялікая група першакурснікаў. Хочацца пажадаць ім вялікіх поспехаў у вучобе і, вядома, у спорце.

С. КАМІНСКІ,
старшыня спартыўнага клуба БДУ.

СТАРТЫ З ПРАЦЯГАМ

Новы комплекс ГПА патрабуе не толькі масавага ўдзелу ў здачы норм, але і несумненна добрай падрыхтоўкі. І перад факультэтамі не ставіцца задача ў бліжэйшы час рапартаваць аб колькасці супрацоўнікаў, здаўшых нормы. Галоўнае, настроіцца на тое, што ГПА — гэта вельмі сур'ёзна і надоўга. Тут не абысціся перыядычнымі здачамі норм, а трэба павесці паўсядзённую карпатлівую работу, абапіраючыся на грамадскі актыў.

На жаль, не на ўсіх факультэтах прыдаюць гэтаму сур'ёзнае значэнне. Напрыклад, філалагічны факультэт не прымаў удзелу ў здачы норм ГПА па гімнастыцы, хоць было выдзелена месца і назначан час прыёму нарматываў. Не вызначыліся актыўнасцю супрацоўнікі фізічнага, матэматычнага і факультэта прыкладной матэматыкі. Гэтым факультэтам трэба звярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку да здачы норм комплексу ГПА. Праўда, ёсць і добрыя прыклады. Неабходна адзначыць добрую фізічную падрыхтоўку выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта журналістыкі тт. Шылавай, Саламахі, Бондаравай, Вадап'янавай, з хімічнага факультэта т. Гарбуновай і многіх іншых.

Аднак вынікі могуць быць значна вышэй пры ўмове рэгулярных трэніровак. Для таго, каб дасягнуць лепшай фізічнай падрыхтоўкі, умацаваць сваё здароўе і паспяхова асвоіць комплекс ГПА, трэба займацца пастаянна. На стадыёне «Дынама» выдзелен час для заняткаў, ва універсітэце арганізавана група здароўя, заняткі якой праходзяць на паветры таксама на стадыёне «Дынама» два разы ў тыдзень пасля 17 гадзін. Група здароўя ёсць і ў басейне воднаспартыўнага камбіната, яе можна наведваць таксама ў вячэрні час. Так што магчымасці ёсць, патрэбна толькі жаданне быць здаровым, фізічна моцным.

М. ЦЕРАХАВА,
інструктар МК.



Адна з важнейшых задач, якія стаяць у цяперашні час перад навуковай фатаграфіяй, заключаецца ў распрацоўцы новых прынцыпаў атрымання фатаграфічных адбіткаў, не патрабуючых выкарыстання дэфіцытнага серабра або дазваляючых значна скараціць яго расходаванне.

Сумесныя даследаванні, праведзеныя на кафедры неарганічнай хіміі нашага універсітэта і ў лабараторыі кінетыкі рэакцый у цвёрдых целах Інстытута кінетыкі і гарэння Сібірскага аддзялення АН СССР паказалі магчымасць рашэння гэтай задачы.

На здымку: малодшы навуковы супрацоўнік кафедры неарганічнай хіміі Т. В. Луцкіна ў лабараторыі распрацоўкі фотапрацэсаў.

Фота **Д. Чаховіча.**

ВАМ, ФІЛОЛАГІ

Вопросы германской филологии. Ярославль, 1971.

Григорьева, А. Г. Грамматический разбор с помощью линокарт. Учебное пособие. Красноярск, 1971.

Жданов, М. М. Роман И. С. Тургенева «Отцы и дети» в школьном изучении. Л., «Просвещение», 1972.

К текстуальному изучению произведений русской и зарубежной литературы. Метод. пособие. Куйбышев, 1972.

Карпенко, М. А. М. Горький и русский литературный язык советской эпохи. Киев, 1972.

Леонтьев, А. А. Психологические механизмы и пути воспитания умений публичной речи. М., 1972.

Материалы и исследования по русской лексикологии и сибирской диалектологии. Сборник статей. Красноярск, 1971.

Николаева, Т. М. Жест и мимика в лекции. М., «Знание», 1972.

Проблемы русской и зарубежной литературы. Волгоград, 1971.

Формирование марксистской литературной критики в зарубежных славянских странах. Сборник статей. М., «Наука», 1972.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

У СССР 360 тысяч бібліятэк, паслугамі якіх карыстаюцца 180 мільёнаў чалавек.

Кніжны фонд дзяржаўных бібліятэк налічвае 3,3 мільярда кніг.

Аб размерах выпуску твораў класікаў літаратуры гавораць наступныя даныя:

Творы А. С. Пушкіна выдаваліся ў нас 2237 разоў агульным тыражом 122,1 млн. экземпляраў;

Л. М. Талстога — 2154 разы (130,1 млн. экз.);

А. М. Горкага — 2786 разоў (113,1 млн. экз.);

А. П. Чэхава — 1362 разы (71,9 млн. экз.);

М. В. Гогаля — 899 разоў (47,9 млн. экз.);

Т. Р. Шаўчэнкі — 526 разоў (15,8 млн. экз.);

У. У. Маякоўскага — 863 разы (61,9 млн. экз.);

М. А. Шолахава — 757 разоў (46,9 млн. экз.);

М. А. Астроўскага — 510 разоў (20 млн. экз.).

Працы К. Маркса і Ф. Энгельса ў СССР за паўвека выпушчаны тыражом 96,5 млн. экз. на 81 мове.

Па даных ЮНЕСКА Савецкі Саюз займае першае месца ў свеце па выпуску перакладной літаратуры. Пасля Вялікага Кастрычніка ў нашай краіне выдадзены пераклады твораў аўтараў 101 замежнай краіны.

У цяперашні час ва ўсіх краінах свету штогод выдаецца каля паўмільёна назваў розных кніг.

КНІГА—НАРОДУ

Па прапанове Савецкага Саюза Генеральная асамблея ЮНЕСКА аб'явіла 1972 год Міжнародным годам кнігі, навыкаў чытання і бібліятэк. Гэты факт пераканаўча гаворыць аб вялікім аўтарытэце друкаванага слова, прызнанні вялікай стваральнай ролі кнігі, якая не толькі нясе людзям веды аб мінулым і сучасным, але і асвятляе шлях у будучае.

І хоць у свеце яшчэ сустракаюцца песімісты, якія прадказваюць, што кніга не вытрымае канкурэнцыі з тэлебачаннем і іншымі навейшымі сродкамі распаўсюджання інфармацыі, кожнае новае пакаленне людзей зноў і зноў на сваім вопыце пераконваецца ў тым, што без кнігі немагчымы сацыяльна-эканамічны і культурны прагрэс, што зварот да яе — вышэйшая і незаменная форма інтэлектуальнага развіцця асобы. «Усюды, дзе ёсць ніва, усюды, дзе ёсць розум чалавечы, павінна быць кніга», — справядліва заўважыў неяк Віктор Гюго.

Мы па праву ганарымся тым, што савецкая кніга заўсёды служыць дзейсным сродкам камуністычнага выхавання і арганізацыі мас, крыніцай ведаў і вопыту. Непахісная першаасновай савецкага кнігавыдання, як і ўсяго нашага друку, з'яўляюцца ленінскія прынцыпы партыйнасці, народнасці, масавасці.

У нашай краіне вялікі інтарэс да кнігі, гаварыў на XXIV з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў. Па праву савецкі народ лічыцца самым чытаючым народам у свеце.

Кніга ў нас даўно стала здабыткам усіх працоўных, неад'емнай часткай іх духоўнага жыцця, яна ўвайшла ў быт кожнай сям'і. Па даных выбарачнага сацыялагічнага даследавання 95 працэнтаў сем'яў у СССР купляюць кнігі, маюць асабістыя бібліятэкі. У сярэднім кожная савецкая сям'я цяпер набывае па 25—30 кніг у год. А ў вялікіх гарадах кожны працуючы купляе кніг на суму, роўную амаль 3 працэнтам месячнага заработку.

Кнігавыданне ў СССР — адна з важных асноў многанацыянальнай сацыялістычнай культуры. Каб уявіць, наколькі хутка развівалася выдавецкая справа ў нацыянальных рэспубліках і абласцях, адзначым толькі адзін факт: за гады Савецкай улады тыражы кніг на мовах народаў СССР (акрамя рускай) выраслі ў 53 разы. За гэты час былі выдадзены творы пісьменнікаў сямідзесяці нацыянальнасцей. Савецкую кнігу цяпер можна сустрэць у самых розных кутках свету, у самых «гарачых» пунктах планеты, дзе яна ўзята на ўзбраенне ўсімі, хто мужна змагаецца за сацыяльнае раўнапраўе, супраць прыгнятальнікаў народаў.

Савецкую кнігу цяпер чытаюць больш чым у ста дзяржавах свету. Штогод у 60—70 розных краінах арганізуюцца выстаўкі савецкіх выданняў, з іх экспазіцыямі знаёмяцца да сарака мільёнаў чалавек. Нават зарубежныя спецыялісты павінны прызнаць, што Савецкі Саюз з дня яго ўзнікнення стаіць на чале міжнароднага кніжнага руху.

Міжнародны год кнігі — гэта добрая аснова для сур'ёзнага роздуму аб пройдзеным шляху, аб нашых поспехах і ў той жа час для калектыўнага абмеркавання перспектыў развіцця кніжнай справы, яе месца ў здзяйсненні новай пяцігодкі, у ператварэнні ў жыццё ўнутранай і знешняй палітыкі партыі.

У праграме Міжнароднага года кнігі, як вядома, прадугледжваецца правядзенне мноства канферэнцый чытачоў, выставак. Савецкая кніга будзе экспанавацца на спецыяльнай выстаўцы ў штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы. У многіх краінах адкрыюцца выстаўкі літаратуры, прысвечаныя 50-годдзю ўтварэння СССР. Савецкая кніга знаходзіць усё больш шырокія шляхі да сэрцаў мільёнаў чытачоў на ўсіх кантынентах, вышэй узнімецца яе роля як магутнай зброі пазнання і рэвалюцыйнага пераўтварэння свету.

І. АРЭХОЎСКАЯ.

У ЧАКАННІ ВОСЕНІ.

Фота *Д. Чаховіча.*

СЛОВА АБ КНІГАХ

Якое багацце мудрасці і дабра заразлівага рассыпана па кнігах усіх народаў і часоў.

Л. М. ТАЛСТОЙ.

Кнігі збіраюць жамчужыны чалавечай думкі і перадаюць іх нашчадкам. Мы ператворымся ў жменю праху, але кнігі, нібы помнікі з жалеза і каменя, захаваюцца навек.

АЙБЕК.

Кніга больш магутная за армію агітатараў: яна пранікае ў самыя глухія куткі, яе чытаюць, яна пакідае след у свядомасці, і калі яна яркая, калі яе напісаў бальшавік аб нашых днях, то яна будзе служыць рэвалюцыі.

М. А. АСТРОЎСКІ.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01374

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 989.